Слова для Жыцця (5)

Аўтар: Святы Айцец
25.12.2010 03:00



Папа Бэнэдыкт XVI

Свет патрабуе Бога – чытаем у заканчэнні паслання на Сусветны дзень міру. – Патрабуе ўніверсальных і агульных этычных і духоўных каштоўнасцяў, а рэлігія можа ўнесці цэнны ўклад у іх пошук, каб удалося збудаваць справядлівы і мірны грамадскі лад на нацыянальным і міжнародным узроўнях. (…) Я заахвочваю ўсіх, хто хоча стаць будаўнікамі міру, а асабліва маладых людзей, услухацца ў свой унутраны голас, каб знайсці ў Богу пастаянны пункт суаднесенасці для атрымання сапраўднай свабоды; невычэрпную сілу, якая дазволіць кіраваць светам з новым духам, так, каб не дапусціць ізноў памылак мінулага

Фрагмент паслання на Сусветны дзень міру †



Кардынал Зянон Грахалеўскі

Сёлетняя канцэпцыя адносін дзяржаўных улад да рэлігіі такая, што дзяржава некампетэнтна ў рэлігійных справах. Да дзяржавы не належыць падтрымаць рэлігію, а паважаць правы сваіх грамадзян. Калі паўстае каталіцкая школа, г. зн. яна неабходна, калі паўстае праваслаўная школа, г. зн. тут яна патрэбна, і дзяржава шануе права грамадзян. Бацькі маюць права выхоўваць сваіх дзяцей паводле ўласных перакананняў. Гэта з'яўляецца правам бацькоў. Роля ж Касцёла і дзяржавы асноўваецца на тым, каб дапамагаць бацькам у рэалізацыі іхняга права і абавязку.

Фрагмент інтэрв'ю для grodnensis.by



Кс. біскуп Уладзіслаў Блін

Усё з’яўляецца справай Святога Духа. І біскуп, і святар, і сям’я, і развіццё Касцёла, і тое, як павінна гэта выглядаць. Але мы павінны быць адкрыты на ўздзеянне Святога Духа і дазволіць Яму дзейнічаць… Святарства – гэта прыняцце з любоўю Хрыстовага крыжа на свае плечы. І як з любоўю гэта прымецца, то тады не адчуваецца гэтага цяжару. Так ёсць у жыцці кожнага з нас. Так ёсць у сужэнстве. Чаму існуюць разводы, аборты? Таму што мы не хочам прыняць з любоў Хрыстовага крыжа, які прызначаны чалавеку не як пакаранне, а для таго, каб мы сумавалі па небу і маглі быць шчаслівымі, прымаючы тое, што дае нам Бог.

Фрагмент інтэрв’ю для grodnensis.by